УДК 671.12

Н.І. Наркевіч, асістэнт

# РОЛЯ ЮВЕЛІРНЫХ УПРЫГАЖЭННЯЎ У ЖЫЦЦІ БЕЛАРУСКАЙ ЖАНЧЫНЫ X–XIII СТСТ. (НА ПРЫКЛАДЗЕ ТЭРЫТОРЫІ МІНСКА)

The article is devoted to studying women's jewellery of the Xth–XIIIth centuries on the basis of acheological data of ancient Minsk.

Ювелірнае мастацтва – адзін з найстаражытнейшых і шырока распаўсюджаных відаў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. Шматлікія рэчы, зробленыя ювелірамі, невялікія ў памерах, але іх мастацкае значэнне, прыгажосць і выразнасць такія грандыёзныя, што дапамагаюць нам адчуць і зразумець эпоху, каларыт часу, у якім яны ствараліся.

Яшчэ ў каменным веку людзі ўпрыгожвалі сябе каралямі з зубоў жывёл ці ракавінак, нанізаных на сухажыллі. Ужо тады значнае месца адводзілася вырабам, якія былі цесна звязаны з пераменлівымі ўмовамі гістарычнага побыту і мелі ролю своеасаблівых знакаў, выяўляючых сацыяльны статус іх уладальніка.

Вялікі матэрыял аб развіцці ювелірнай справы ў старажытнасці даюць археалагічныя раскопкі. Асноўная маса ўпрыгажэнняў на тэрыторыі Беларусі ў X–XIII стст. рабілася мясцовымі майстрамі, аб чым сведчаць ліцейныя формачкі. Высокага майстэрства дасягнула ювелірнае рамяство ў часы Полацкага і Тураўскага княстваў. Ювелірныя майстэрні існавалі ў Полацку, Навагрудку, Мінску і іншых гарадах. Нягледзячы на тое, што на працягу X–XI стст. упрыгажэнні, распаўсюджаныя ва ўсіх славянскіх плямёнах, былі падобны паміж сабой па тыпу і адзінству прыёмаў тэхнічнага выканання, увагі заслугоўвае вывучэнне ювелірных вырабаў, знойдзеных пры раскопках Мінска.

Вялікую калекцыю сярод археалагічных матэрыялаў складаюць жаночыя ўпрыгажэнні. У вопратцы старажытных славян упрыгажэнні займалі значнае месца. Канкрэтная размова аб жаночых ювелірных упрыгажэннях адзення любога гістарычнага перыяду пачынаецца з вызначэння таго, якім было адзенне і якую ролю ігралі ў ім ювелірныя вырабы, як яны выкарыстоўваліся.

Жаночыя галаўныя ўборы з'яўляліся найважнейшай часткай касцюма. Яны строга падзяляліся на дзявочыя ўборы і ўборы замужніх жанчын. Таксама адрозніваліся ўборы вясковых жанчын, гараджанак і знаці. Аблюбаваным упрыгажэннем жанчын былі *скроневыя кольцы*, якія звычайна прышываліся ці прымацоўваліся да венчыкаў і чапцоў. Часам іх упляталі ў валасы, пазней скроневыя кольцы сталі выконваць ролю завушніц. Дадзеныя ўпрыгажэнні лічыліся асноўным этнічным індыкатарам, і пачыналі іх насіць дзяўчынкі з пэўнага ўзросту. У Мінску знойдзены персценепадобныя дротавыя скроневыя кольцы, якія адрозніваліся разнастайнасцю формаў і памераў. Да скроневых упрыгажэнняў адносяцца *колты*, якія з'яўляліся дапаўненнем да галаўных убораў заможных гараджанак. З іх узнікненнем пачынаецца новы этап развіцця ювелірнага мастацтва. Колты маюць новыя па матывах выявы, яны разнастайныя па формах і адрозніваюцца сапраўды дасканалым ювелірным выкананнем. Іх прымацоўвалі да галаўнога ўбору над скроней на складзеным у два разы ланцужку ці стужцы.

На тэрыторыі Мінска знойдзены два колты. Першы зроблены з дзвюх спаяных паміж сабой па канцах срэбраных пласцін, на кожнай з якіх створаны вобразы фантастычных птушак з павернутымі адна да адной галовамі. У дэкоры металічных вырабаў шырока прадстаўлены стылізаваныя выявы розных жывёл і птушак, цесна звязаныя з магічнымі ўяўленнямі язычніцтва, прыкладам можа служыць вышэйапісанае ювелірнае ўпрыгажэнне.

Другі колт быў зроблены з алавянага сплаву. Паверхня пласцін аздоблена ўзорамі, якія складаюцца з дробных зерняў-шарыкаў, а пустацелыя буйныя шарыкі акружалі ювелірны выраб. Як правіла, колты былі полымі, у сярэдзіну ўкладвалася тканіна з пахучымі масламі. Так надушваліся мінскія жанчыны.

Разнастайных жаночых упрыгажэнняў увогуле на Міншчыне знойдзена шмат. У сукупнасці яны складалі выразны дэкор старажытнаму касцюму. Багацце ювелірных упрыгажэнняў часткова кампенсуе адносную беднасць жаночага адзення.

Вопратка Міншчыны шылася з рознай тканіны. Поруч з адносна простымі ільнянымі і шарсцянымі аднакаляровымі тканінамі знойдзены рэшткі вельмі шыкоўных з арнаментамі вырабаў. Прыгожае адзенне феадалаў і заможных гараджан абшывалася жэмчугам, аб гэтым сведчаць раскопкі Мінскага Замчышча ў пластах XII ст. Жанчыны, згодна з даследаваннем археолага Загарульскага, насілі доўгія сукенкі, якія былі падпяразаны ў таліі шарсцяным поясам са спражкай. Валасы спляталіся ў дзве касы, якія ўкладваліся вакол галавы. Лоб павязваўся стужкай, да яе падвешваліся разнастайныя ўпрыгажэнні, пра якія ўжо ішла размова. На нагах былі мягкія скураныя туфлі, часта аздобленыя вышыўкай.

Выкарыстанне старажытнымі славянамі ўпрыгажэнняў мела не толькі эстэтычнае значэнне, ювелірныя вырабы надзяляліся таксама функцыянальным характарам. Распаўсюджаным упрыгажэннем былі *нагрудныя падвескі*, якія яшчэ ў часы язычніцтва служылі амулетамі, каб зберагчы ўладальніка ад хвароб, няшчасных выпадкаў. Да нагрудных упрыгажэнняў адносяцца падвескі, якія насілі на шнурках, ланцужках або ў складзе караляў разам з пацеркамі, а таксама *шыйныя грыўні*, *фібулы, шпількі.* Даволі распаўсюджанымі падвескамі былі *лунніцы* і *конікі.* Лічыцца, што лунніцы былі сімвалам багіні Селены, якая апекавала дзяўчат, і таму гэтыя ўпрыгажэнні насілі менавіта дзяўчаты. У Мінску знойдзены лунніцы, паверхня якіх адліта з бронзы і аздоблена зерневым арнаментам. Падвескі-амулеты рабіліся з розных металаў, косці, шыферу, бурштыну, што сведчыць аб значнай ролі дадзеных ювелірных вырабаў. Цікавасць уяўляюць конікі-амулеты, якія былі сімваламі дабра і шчасця. Упрыгажэнне з выявай стылізаванага каня, знойдзенае ў Мінску, па форме мала чым адрозніваецца ад стандартных падвесак іншых рэгіёнаў Беларусі. Звычайна амулет-конік уваходзіў у склад набору, які ўключаў бразготку, ключык, лыжачку і інш. Другі бронзавы амулет меў форму маленькага мяча з адтулінай у сярэдзіне для падвешвання. Каля Мінска вядома знаходка касцяной падвескі ў выглядзе калчана на бронзавым ланцужку. Распаўсюджанымі ў тыя часы з'яўляліся падвескі-бразготкі, яны рабіліся з бронзы або білону і ўваходзілі ў склад караляў разам з пацеркамі, прымацоўваліся да паясоў, галаўных убораў, нашываліся на адзенне, абутак, выкарыстоўваліся замест гузікаў. Такія падвескі лічыліся сімвалам Перуна, і насілі іх для аховы ад злых духаў. Сярод падвесак шмат крыжыкаў з металу, шыферу, бурштыну, але яны ў тыя часы яшчэ не былі сімваламі хрысціянства.

Значная ўвага ўдзялялася ўпрыгожванню рук жанчыны *пярсцёнкамі* і *бранзалетамі.* Бранзалеты вядомы з часоў каменнага веку. Спачатку яны рабіліся з біўня маманта, пазней – з розных металаў і сплаваў. У пачатку 2-га тысячагоддзя асаблівым попытам карысталіся бронзавыя, у гарадах шкляныя бранзалеты. На тэрыторыі Мінска іх знойдзена каля тысячы штук, але з прычыны ломкасці матэрыялу толькі адзін бранзалет аказаўся цэлы, астатнія прадстаўлены ў абломках. Бранзалеты адрозніваюцца паміж сабой колерам, формай, таўшчынёй, хімічным саставам і г. д. Цікава адзначыць, што ў розны час назіраецца мода на пэўны тып ці колер бранзалета. Так, у канцы XI – пачатку XII ст. моднымі ў Мінску былі чорны, сіні і блакітны колеры. Зялёныя і карычневыя бранзалеты распаўсюджваюцца ў XII–XIII стст. У канцы XI – першай палове XII ст. насілі пераважна кручаныя, дастаткова тоўстыя ўпрыгажэнні для рук, а з другой паловы XII ст. становяцца моднымі тонкія гладкія бранзалеты. На тэрыторыі Беларусі бытавалі амаль усе віды бранзалетаў, вядомыя тагачаснай Усходняй Еўропе, а таксама зааморфныя, балцкія па паходжанню. Вылучаюцца дротавыя, вітыя, кручаныя, плеценыя, гладкія (сегментападобныя ў сячэнні) з зааморфнымі галоўкамі, пласцінчатыя арнаментаваныя, створкавыя (бранзалеты-наручы) і інш. У вяскоўцаў у модзе былі вітыя і зааморфныя бранзалеты, у гарадах пласцінчатыя, зрэдку іх насілі ў вёсцы. Арнамент на гарадскіх пласцінчатых бранзалетах быў больш

складаным і разнастайным, чым на вясковых. Увогуле ж узор на пласцінчатых бранзалетах складаўся з розных зігзагаў, ромбаў, кружочкаў з кропкай у цэнтры, пункцірных ліній. Да XIII ст. у асноўным бытаваў геаметрычны арнамент, затым з'явіліся элементы раслiннага. Кожны элемент арнаменту быў звязаны з язычніцкай сімволікай і лічыўся абярэгам. Нягледзячы на тое, што асноўным матэрыялам была бронза, сустракаліся сярэбраныя і залатыя бранзалеты. Пры раскопках Мінскага Замчышча знойдзены масіўны (75,472 г) залаты бранзалет. Ён сплецены з трох складзеных удвая і перавітых паміж сабой дроцікаў. Канцы ўпрыгажэння пераходзяць у стылізаваныя галовы змей, адлітыя з высокім майстэрствам. Несумненна, бранзалет належаў прадстаўніцы заможных слаёў насельніцтва.

Апісанне жаночага ўбрання будзе няпоўным, калі не нагадаць аб пярсцёнках і пацерках.

Пярсцёнкі выраблялiся з медзі, бронзы, серабра, шкла, волава, білону, бурштыну, золата. Больш за ўсё былі распаўсюджаны дротавыя, якія часта выраблялі ў два ці тры абароты, а таксама пласцінчатыя з цiснёным арнаментам і шырокасярэдзінныя пярсцёнкі. Шкляныя пярсцёнкі былі тыповым упрыгажэннем рук жанчын Міншчыны. Іх знойдзена няшмат, але ўражвае разнастайнасць формаў і колераў пярсцёнкаў, што сведчыць аб высокім майстэрстве вытворцаў дадзеных упрыгажэнняў.

Пацеркі былі модным упрыгажэннем. Пры раскопках Мінскага Замчышча было знойдзена звыш сотні розных відаў пацерак. Найбольш распаўсюджаны быў рублены бісер сіняга, жоўтага і зялёнага шкла.

Сустракаліся не толькі шкляныя ўпрыгажэнні рук, але і касцяныя, каменныя, бурштынавыя, разнастайныя па форме і тэхніцы выканання. Акрамя ўпрыгажэнняў, пацеркі выкарыстоўваліся замест гузікаў, у тым ліку і ў мужчынскім адзенні. Пацеркамі вышывалася адзенне, галаўныя ўборы, абутак. Яны нанізваліся на скроневыя кольцы і завушніцы, на тасьму ў паясах і наплечных пакрывалах.

Такім чынам, упрыгажэнні пачатку 2-га тысячагоддзя падраздзяляюцца на скроневыя, нагрудныя і ўпрыгажэнні рук, усе яны з'яўляліся носьбітамі інфармацыі аб жыцці жыхароў старажытнай Беларусі. Канструктыўныя ці выяўленчыя прынцыпы, якія стаялі ў аснове вырабу упрыгажэнняў, адрозніваліся выразнасцю і прастатой. Гэта было своеасаблівае абагульненне, прадстаўленае ў выглядзе знака, змест якога зразумелы кожнаму члену грамадства. На прыкладзе жаночых ювелірных упрыгажэнняў Міншчыны можна бачыць, як самыя розныя вырабы служылі неад'емнай часткай адзення. Магчыма ўявіць сабе, наколькі ўрачыстым і прыгожым было ўбранне старажытнабеларускай жанчыны, якое дапаўнялася гэтымі ювелірнымі ўпрыгажэннямі. Здзіўляе высокае майстэрства іх вытворцаў, уменне разумець і цаніць прыгажосць матэрыялу. Ювелірныя вырабы расказваюць аб творчым развіцці чалавека, аб яго мастацкіх ідэалах.